# § 17. Прыродаахоўныя тэрыторыі

***Успомніце.*** *Навошта ствараюцца прыродаахоўныя тэрыторыі? Якія тыпы прыродаахоўных тэрыторый свету вы ведаеце?*

**1. Сетка прыродаахоўных тэрыторый.** Тэрыторыя Беларусі характарызуецца вялікай ландшафтнай разнастайнасцю. Для захавання ландшафтаў ствараюцца прыродаахоўныя тэрыторыі. Да іх адносяцца запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды. Кожны з тыпаў прыродаахоўных аб’ектаў мае асаблівы рэжым аховы. Разам яны ўтвараюць сетку асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ) рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Да ААПТ рэспубліканскага значэння ў Беларусі адносяцца адзін запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі, 99 заказнікаў і 322 помнікі прыроды (на 01.01.2023). Да аб’ектаў мясцовага значэння адносяцца 275 заказнікаў і 634 помнікі прыроды. Сумарна яны займаюць плошчу каля 1,9 млн га, або 9,1 % тэрыторыі краіны. Цягам апошніх гадоў плошча ААПТ павялічваецца.

Статус міжнародных біясферных рэзерватаў маюць *Бярэзінскі біясферны запаведнік, нацыянальны парк «Белавежская пушча»*, заказнік «Прыбужскае Палессе». Больш за 70 аб’ектаў з’яўляюцца ключавымі батанічнымі тэрыторыямі, а таксама тэрыторыямі, важнымі для птушак, або водна-балотнымі ўгоддзямі міжнароднага значэння. Многія ААПТ увайшлі ў Смарагдавую сетку Еўропы (сетка ААПТ, якія маюць агульнаеўрапейскае значэнне).

Прыродаахоўныя тэрыторыі па краіне размешчаны нераўнамерна. Найбольшую плошчу яны займаюць у Брэсцкай і Віцебскай абласцях, а найменшую — у Магілёўскай (мал. 61). Якімі прычынамі можна растлумачыць такое размяшчэнне прыродаахоўных аб’ектаў?




Мал. 61. Плошчы ААПТ па абласцях Беларусі, тыс. га

**2. Запаведнікі і прыродныя нацыянальныя паркі.** У запаведніках забаронены ўсе віды гаспадарчай дзейнасці. Поўны запаведны рэжым

| Запаведнікі | Нацыянальныя паркі | | | |
|---|---|---|---|---|
| Бярэзінскі біясферны | Белавежская пушча | Браслаўскія азёры | Нарачанскі | Прыпяцкі |
|  |  |  |  |  |

Мал. 62. Запаведнікі і нацыянальныя паркі Беларусі

падтрымліваецца толькі на тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка. У канцы XX ст. у Беларусі з’явіліся нацыянальныя паркі. Асноўныя іх задачы: захаванне ўнікальных прыродных комплексаў, правядзенне навуковых даследаванняў, рэкрэацыйная дзейнасць. У нацыянальных парках вылучаюцца зоны з рознай ступенню аховы. У цяперашні час у Беларусі чатыры нацыянальныя паркі: «Белавежская пушча», *«Браслаўскія азёры»*, *«Нарачанскі»*, *«Прыпяцкі»* (мал. 62). Сумарна запаведнікі і нацыянальныя паркі займаюць плошчу 475 тыс. га, або 2,3 % тэрыторыі краіны.

Знайдзіце на карце атласа (с. 27) запаведнік і нацыянальныя паркі.

**3. Заказнікі** займаюць больш за 70 % плошчы ААПТ. Яны ствараюцца з мэтай захавання ўнікальных прыродных комплексаў, рэдкіх відаў раслін і жывёл. У Беларусі заказнікі рэспубліканскага значэння займаюць плошчу больш за 980 тыс. га, мясцовага значэння — больш за 420 тыс. га. Асобныя заказнікі па плошчы не саступаюць запаведнікам. Так, «Сярэдняя Прыпяць» і «Альманскія балоты» маюць плошчу звыш 90 тыс. га. Многія заказнікі звязаны з буйнымі азёрамі: «Асвейскі», «Сялява», «Свіцязянскі», «Выганашчанскае», водна-балотнымі комплексамі: *«Ельня»*, «Астравы Дулебы», ляснымі масівамі: *«Налібоцкі»*, «Казьянскі». Больш шматлікія заказнікі мясцовага значэння, многія з якіх могуць стаць аб’ектамі для краязнаўчай працы.

Знайдзіце на карце атласа (с. 27) пералічаныя заказнікі.

**4. Помнікі прыроды.** Некаторыя ўнікальныя прыродныя аб’екты Беларусі (часам створаныя штучна) маюць навуковае значэнне. Усе гэтыя аб’екты зацвярджаюцца дзяржавай у якасці помнікаў прыроды. У Беларусі вылучаецца 956 помнікаў прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння. Яны падзяляюцца на тры групы: геалагічныя, батанічныя і гідралагічныя.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 63. Парк «Залессе» ў Смаргонскім раёне

Найбольш распаўсюджаны геалагічныя помнікі прыроды. Да іх адносяцца геалагічныя агаленні, берагавыя ўступы, буйныя валуны і іх групы, дзюны і інш. Часцей за ўсё яны прымеркаваны да паўночных і цэнтральных раёнаў краіны.

Другую па колькасці групу ўтвараюць батанічныя помнікі прыроды. Сярод іх больш за 20 паркаў з каштоўнымі насаджэннямі: «Альба», «Савейкі», «Залессе» (мал. 63) і інш. Большасць з іх звязана з былымі магнацкімі сядзібамі. Сустракаюцца каштоўныя насаджэнні такіх рэдкіх раслін, як лістоўніца, карэльская бяроза, піхта белая і інш.

Але найбольш распаўсюджаны сярод батанічных помнікаў прыроды векавыя дрэвы, перш за ўсё дубы-волаты. Так, цар-дуб Пажэжынскі ў Маларыцкім раёне вылучаецца ўзростам (каля 800 гадоў) і памерамі (вышыня — 46 м).

Гідралагічных помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння ў Беларусі менш за 30 — гэта крыніцы і мінеральныя крыніцы. «Палыкавіцкая крыніца» ў Магілёўскім раёне характарызуецца павышанай мінералізацыяй вады.

**5. Перспектывы пашырэння сеткі прыродаахоўных аб'ектаў.** Разлікі навукоўцаў паказваюць, што прыродаахоўныя тэрыторыі павінны займаць каля 10 % плошчы краіны. Плошча прыродаахоўных аб'ектаў у Беларусі меншая, і размешчаны яны нераўнамерна. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай штогод ствараюцца новыя прыродаахоўныя аб'екты.

Для захавання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці распрацоўваецца Нацыянальная экалагічная сетка. У 2018 г. зацверджана схема і складзена яе карта. На тэрыторыі Беларусі вылучаны ядры экалагічнай сеткі еўрапейскага, нацыянальнага і рэгіянальнага значэння, калідоры і ахоўныя зоны. Ядрамі экалагічнай сеткі сталі запаведнік, нацыянальныя паркі і заказнікі, калідорамі — лясныя масівы, участкі балот, рачныя даліны і іншыя землі прыроднага каркаса.

**Падвядзём вынікі.** Сетка ААПТ Беларусі ўключае 1335 аб’ектаў, якія займаюць 9,1 % тэрыторыі краіны. У склад ААПТ уваходзяць Бярэзінскі біясферны запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі: «Белавежская пушча», «Браслаўскія азёры», «Прыпяцкі», «Нарачанскі», 99 заказнікаў і 322 помнікі прыроды рэспубліканскага значэння. Самую вялікую плошчу ў структуры ААПТ займаюць заказнікі рэспубліканскага значэння — больш за 70 %.

***Праверце сябе.*** 1. Якія віды прыродаахоўных тэрыторый вылучаюцца ў Беларусі? 2. Які від ААПТ займае самую вялікую плошчу ў Беларусі? 3. Які від ААПТ лідзіруе ў Беларусі па колькасці? 4. Якая група помнікаў прыроды пераважае ў Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. З якой мэтай праводзіцца функцыянальнае заніраванне нацыянальных паркаў? 2. Чаму геалагічныя помнікі прыроды часцей сустракаюцца на поўначы і ў цэнтральных раёнах краіны, а батанічныя — на поўдні і ў цэнтральных раёнах? 3. Чаму Бярэзінскі запаведнік называюць біясферным?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Ахарактарызуйце прыродаахоўныя аб’екты сваёй мясцовасці і вызначце, якія яшчэ прыродаахоўныя аб’екты могуць з’явіцца ў вашым раёне ў хуткім часе. Адказ абгрунтуйце. 2. З дапамогай матэрыялаў атласа (с. 5) і інфармацыі з малюнка 61 разлічыце, якую долю займаюць ААПТ у межах абласцей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне